75 ГОД ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

# Баі на Нёмане

## Чаму вызваленчыя баі за левы бераг Нёмана доўжыліся некалькі дзён і якую ролю адыграла ў вызваленні Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў кавалерыя?

**Правабярэжную частку горада савецкія войскі занялі 16 ліпеня 1944 года. Гэты дзень лічыцца датай вызвалення Гродна. У той жа вечар у гонар пераможцаў у Маскве былі дадзены 20 залпаў з 224 гармат.**

– Гродна быў вызвалены ў выніку маштабнай наступальнай аперацыі «Баграціён», калі дакладней, то падчас Беластоцкай франтавой аперацыі, – распавядае ваенны гісторык, адзін з аўтараў кнігі «Гарачы ліпень» Дзмітрый Люцік. – Праводзілася яна сіламі 2-га Беларускага фронту – 49-й арміяй генерала Грышына і 50-й арміяй генерала Болдзіна. Што цікава: Івана Болдзіна лёс тройчы прыводзіў у Гродна. У верасні 1939 года ён штурмаваў гэты горад падчас далучэння Заходняй Беларусі да БССР, у чэрвені 1941-га яго група няўдала нанесла контрудар, і вось летам 1944 года генерал вярнуўся, каб вызваліць Гродна, – звяртае ўвагу наш суразмоўца. – Значную ролю ў баях за горад адыграў і 3-ці гвардзейскі кавалерыйскі корпус генерала Аслікоўскага. Для мяне гэта стала адкрыццём у свой час: у эпоху танкаў і самалётаў конніца падавалася анахранізмам, але жыццё даказала адваротнае.

Прарыў савецкіх войскаў быў імклівым. Коннікі ішлі з боку Ліды. Каля станцыі Парэчча першай у атаку пусцілі трафейную «Пантэру». Немцы разгубіліся, убачыўшы свой танк. Да Гродна кавалерыя выйшла з поўначы. 13 ліпеня разгарнуліся першыя баі. На дапамогу падаспеў 36-ты корпус 31-й арміі 3-га Беларускага фронту. Акрамя палкоў паліцыі, у немцаў былі два разведвальна-танкавыя батальёны (5-ты і 12-ты). Можна знайці звесткі аб тым, што ў баях каля Гродна яны выкарыстоўвалі танкі і самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі. Аднак Дзмітрый Люцік лічыць гэта памылкай – у немцаў былі толькі бронетранспарцёры.

– 15 ліпеня з боку вёскі Вялікая Капліца ў Гродна прарваўся кавалерыйскі корпус Аслікоўскага, а з усходу (дзе зараз знаходзіцца праспект Касманаўтаў. **– Заўв. аўт.**) – армія Болдзіна, якая ўжо вызваліла Скідаль. Позна ўвечары пачаліся баі непасрэдна ў горадзе. Коннікаў і пяхоту падтрымліваў 1444-ты самаходны артылерыйскі полк палкоўніка Мячава. Цікава, што свае танкі былі і ў кавалерыі – англійскія Мк. III «Валянтайн». Яны паступалі ў Савецкі Саюз па ленд-лізе (праграма, згодна з якой ЗША пастаўлялі сваім саюзнікам у Другой сусветнай вайне баявыя прыпасы, тэхніку, харчаванне, медыцынскае абсталяванне і іншае. **– Заўв. аўт.**). Падчас баёў былі падбіты дзве такія машыны, і экіпаж выкарыстоўваў іх у якасці нерухомых агнявых пунктаў, – заўважае гісторык.



Разлікі савецкіх 82-мм мінамётаў узору 1941 года падчас баёў за Гродна. 16 ліпеня 1944 г.



Радавы М.Пудчаў патрулюе вуліцу вызваленага Гродна. Ліпень 1944 г.



Разбураны цэнтр Гродна. На заднім плане ўцалелы касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі (Фара Вітаўта). 1944 г.

Раніцай 16 ліпеня асноўная частка горада была вызвалена, і 352-я дывізія пачала зачыстку. Адступаючы, гітлераўцы замініравалі горад. Паводле звестак радыёперахопу, камандуючы абаронай Гродна обергрупенфюрэр СС Курт фон Готберг атрымаў загад на поўнае знішчэнне. На выратаванне прыбыла 1-я гвардзейская Магілёўская асобная інжынерна-штурмавая брыгада – элітнае падраздзяленне. Яго байцы былі экіпіраваны нават стальнымі нагруднікамі – праобразамі сучасных бронекамізэлек.

Левабярэжную частку Гродна вызвалілі толькі праз 8 дзён – 24 ліпеня.

– Справа ў тым, што немцы паспелі ўвесці ў бой 3-ю танкавую дывізію СС «Мёртвая галава», перакінуўшы яе з Румыніі. Да таго ж у пачатку баёў за горад авіяцыйныя палкі знаходзіліся пад Мінскам. Пяхота і кавалерыя заставаліся амаль без прыкрыцця з неба. Немцы знішчалі пераправы праз Нёман і блакіравалі наступленне, – тлумачыць Дзмітрый Люцік. – Вядома, што ў камандны пункт 50-й арміі да генерала Болдзіна прыехаў маршал Жукаў, які кантраляваў дзеянні франтоў падчас аперацыі «Баграціён». Сітуацыя была вельмі напружанай. 50-я армія не магла пераадолець раку, а корпус Аслікоўскага, які фарсіраваў Нёман, адрэзалі ў Аўгустоўскіх лясах.

Дарэчы, Аслікоўскі адчуваў, што тром яго дывізіям, калі яны адарвуцца ад пяхоты, давядзецца няпроста. Генерал нават прыгадваў лёс арміі Самсонава, якую немцы акружылі і знішчылі ў 1914 годзе ў Аўгустоўскіх лясах. Яго кавалерыя сапраўды трапіла ў такое ж становішча. Сувязі не было, толькі невялікія самалеты Па-2 прылятալі, каб забраць параненых салдат. Выратавалі «банду Аслікоўскага» (так немцы пісалі ў сваіх улётках. **– Заўв. аўт.**) лясы і частыя перадыслакацыі.

Калі 20 ліпеня 230-я штурмавая авіядывізія перабазіравалася ў Скідаль, да баёў далучыліся штурмавікі Іл-2 (7-мы гвардзейскі і 103-ці палкі). Перад імі стаяла задача знішчыць бранетэхніку дывізіі СС «Мёртвая галава». У тых баях удзельнічаў і знакаміты лётчык, двойчы Герой Савецкага Саюза, камандзір эскадрыллі 198-га штурмавога палка капітан Аляксандр Яфімаў. 24 ліпеня яго Іл-2 збілі, але штурмавік дацягнуў да сваіх.

Сітуацыя пачала кардынальна мяняцца 22–23 ліпеня, пасля таго як дывізіі 49-й арміі ўзмацнілі 50-ю і каля Гожы былі пабудаваны некалькі пераправ. Іх адразу напалову затаплялі, каб схаваць ад авіяцыі ворага. За гераічныя баі пад Гродна 17 воінскім часцям і злучэнням было прысвоена ганаровае найменне «Гродзенскія».

Алена КАЯЧ
Фота з адкрытых інтэрнэт-крыніц

1PROF.BY ЗАХОДЗЬ – ДАВЕДАЕШСЯ БОЛЕЙ!